***Мурашка Н. У.***, *магістр педагагічных навук, настаўнік пачатковых класаў сярэдняй школы № 196 г. Мінска;*
***Шылава А. С.***, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту*
*і адукацыйных тэхналогій факультэта кіравання і прафесійнага развіцця педагогаў*
*Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага*
*ўніверсітэта імя Максіма Танка*

# Выкарыстанне інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій пры вывучэнні скорагаворак на ўроках беларускай мовы ў I класе

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, выкарыстання інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці, а таксама фарміраванню вучэбнай дзейнасці малодшых школьнікаў.

The problem of formation of communicative and speech competence in primary school causes necessity of search and introduction of new approaches, the use of intensive educational technologies that promote effective learning and ensure the achievement of predesigned outcomes based on the interaction of stakeholders and the formation of educational activity of younger students.

***Ключавыя словы:*** маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання, тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве, фальклор.

***Keywords:*** communicative and speech competence, technology of collective mutual learning, learning technology in collaboration, folklore.

Кампетэнтнасны падыход у навучанні беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжвае фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, змест якой уключае ў сябе «...валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці; фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін; уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі» [1, с. 33].

Адным са сродкаў фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі з'яўляецца фальклор беларусаў. Беларускі фальклор вельмі багаты і разнастайны, складаецца з вуснай народнай творчасці, традыцыйных свят і абрадаў, песень, танцаў, гульняў і г. д.

Здаўна маладое пакаленне вучылася на вуснай народнай творчасці, большасць твораў якой існуе ў вершаванай форме, што дазваляе іх лёгка завучваць на памяць і перадаваць у вуснай форме. Праз сумеснае паўтарэнне, прадстаўленне, а таксама вусную апрацоўку гэтых тэкстаў узоры інтанацый і сказаў добра запамінаюцца.

Да вуснай народнай творчасці прынята адносіць эпас (казкі, быліны, паданні, легенды) і малыя жанры (пацешкі, скорагаворкі, лічылкі, прыказкі і прымаўкі, загадкі і інш.).

Важная роля ў фарміраванні маўленча-камунікатыўнай дзейнасці дзяцей належыць малым жанрам вуснай народнай творчасці. Мы ўжо расказвалі пра эфектыўныя шляхі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз прыказкі і прымаўкі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання [2], таму тут мы больш падрабязна спынімся на скорагаворках.

Скорагаворкі ўяўляюць сабой спецыяльна прыдуманыя кароткія фразы, пабудаваныя на спалучэнні складаных у вымаўленні гукаў, якія трэба вымавіць хутка, не запінаючыся. У народнай педагогіцы іх выкарыстоўвалі для таго, каб у дзіцяці не было праблем з дыкцыяй і маўленнем у цэлым. Іх функцыя засталася нязменнай і сёння. Работа са скорагаворкамі звязана перш за ўсё з развіццём мовы, маўлення і гукаперайманне.

Выкарыстанне скорагаворак у сучаснай школе разам з эфектыўнымі інтэнсіўнымі адукацыйнымі тэхналогіямі з'яўляецца прывабным і займальным момантам для малодшых школьнікаў. Таму асабліва важна выкарыстоўваць скорагаворкі на ўроках беларускай мовы ў I класе, калі адбываецца

фарміраванне гукавымаўлення і развіццё лексікі ў малодшых школьнікаў.

Курс беларускай мовы ў I класе агульнаадукацыйных школ з рускай мовай навучання з'яўляецца вусным, таму мае шэраг асаблівасцей. Так, напрыклад, навучанне чытанню на беларускай мове адбываецца паступова пасля таго, як вучні авалодаюць навыкам чытання на рускай мове. Акрамя таго, у структуры ўрока з'яўляецца такі этап, як моўная размінка, прызначаная для фарміравання фанетыка-артыкуляцыйных навыкаў.

Згодна з вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання [1, с. 41] вучні павінны ведаць, як вымаўляюцца гукі [ў], [г], [ч], [дз'], [дж], [р], [ц'], спалучэнне [шч], і правільна іх вымаўляць. Акрамя таго, яны павінны ўмець:

• прагназаваць перад слуханнем змест тэксту па ілюстрацыях;

• у час слухання тэксту суадносіць паслядоўнасць падзей з малюнкавым радам;

• адказваць на пытанні па змесце пачутага ці прачытанага з выкарыстаннем слоў пытання;

• ажыццяўляць узаемакантроль правільнасці вымаўлення гукаў [ў], [г], [ч], [дз'], [дж], [р], [ц'], спалучэння [шч] і інш.

Сістэматычная праца са скорагаворкамі на такім этапе ўрока, як моўная размінка, будзе спрыяць фарміраванню апісаных вышэй уменняў, навыкаў і спосабаў дзеяння, а таксама фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. Разгледзім гэта на канкрэтных прыкладах.

Праца настаўніка на ўроке «Беларускай мовы» са скорагаворкамі складаецца з этапаў: 1) вывучэнне і назапашванне; 2) актыўнае выкарыстанне.

**Першы этап: вывучэнне і назапашванне.**

Першы этап патрабуе ад настаўніка працы па падборы скорагаворак у адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы. Для эканоміі часу настаўніка мы зрабілі падборку скорагаворак (табл. 1).*

Праца са скорагаворкамі ў час моўнай размінкі пачынаецца са знаёмства з імі. Настаўнік чытае скорагаворку дзецям, тлумачыць значэнне незразумелых слоў, звяртае ўвагу на асаблівасці вымаўлення асобных гукаў, пасля чаго развучвае яе з класам на памяць.

Для таго каб дзеці хутчэй запомнілі скорагаворку, неабходна прытрымлівацца наступнага алгарытму дзеянняў: 1) настаўнік чытае скорагаворку па частках, а дзеці паўтараюць за ім хорам; 2) настаўнік чытае скорагаворку цалкам, дзеці зноў паўтараюць яе хорам; 3) настаўнік арганізуе парную працу.

Для таго каб арганізаваць парную працу ў I класе, неабходна спачатку навучыць дзяцей працаваць у пары. Выглядае гэта наступным чынам.

Настаўнік выклікае да дошкі каго-небудзь з вучняў (пажадана больш падрыхтаванага) і дэманструе перад усім класам, як яны цяпер будуць

*Табліца 1* — Скорагаворкі для знаёмства з гукамі беларускай мовы

| Гук | Скорагаворка |
|---|---|
| [г] | Руды гарбаты Рыгор гроб грыбы граблямі [3, с. 117].<br>Даў Грыша Галі грушу, Галя Грышу — ягады [4, с. 15].<br>Рыбак Рыгор рыбачыў на рацэ [5, с. 30].<br>І тут гу-гу, і там гу-гу, і нічога разабраць не магу [3, с. 117]. |
| [ў] | Патап пакаваў пакупнікам пакупкі ў пакункі [5, с. 30].<br>Стругаў, стругаў, не дастругаў, стаў дастругваць — перастругаў [5, с. 30].<br>Ткач ткаў хустку на таку і хукаў на руку [5, с. 30].<br>Добра ўсюды добраму. Добраму ўсюды добра [5, с. 29]. |
| [дж] | Доўгім джалам пчала джаліла дудара [3, с. 117]. |
| [ч] | Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне [3, с. 117 ].<br>Скача чапля па балоце, чачотка ў чароце, а чубаты чачот топча, топча агарод [5, с. 30]. |
| [шч] | Шчыгол са шчыгліхай кармілі шчыглят [4, с. 21].<br>Хвошча, хвошча додж, воўк схаваўся ў хвошч. Сам пад хвашчом, а хвост пад дажджом [3, с. 117]. |
| [р] | Раз прывёз Рыгор Цімоху мех арэхаў, мех гароху [5, с. 30].<br>Пракоп і Барыска елі барбарыскі [5, с. 30].<br>Дудар дудару дарма грае [5, с. 29].<br>У Ларысы і Валеры на ліпе арэлі [6, с. 7].<br>Адна сарока — адна марока, сорак сарок — сорак марок [3, с. 29]. |
| [дз'] | Дзятлы дзюбамі дзяўблі дзеравіну [5, с. 29].<br>Дзе цётчынаму дзядзьку дзецца [3, с. 117]. |
| [ц'] | Уцякай, цецеручыха з цецеручанятамі [3, с. 117].<br>Твая маці і мая маці пяклі булкі ў адной хаце [3, с. 30]. |
| Розныя гукі | Белы бусел баіў байку беламу зайку [5, с. 29].<br>Боб да боб — два бабы, а яшчэ боб — тры бабы [5, с. 29].<br>Маша шыла шапку Сашу. Шапку Сашу шыла Маша [5, с. 30].<br>Пёкар Пётр пёк пірог [5, с. 30].<br>Піліп да ліпы прыліп. Да ліпы прыліп і Філіп [5, с. 30].<br>Смешкі кошцы, слёзкі мышцы [5, с. 30].<br>На дыване — канапа, на канапе — Ян, споўз Ян з канапы на дыван [3, с. 117]. |

* У электронным дадатку гл. мультымедыйную прэзентацыю са скорагаворкамі.

працаваць. Педагог расказвае толькі што вывучаную скорагаворку, а вучань паўтарае за ім. Пасля гэтага настаўнік папраўляе памылкі гукавымаўлення вучня. Затым вучань расказвае гэтую ж скорагаворку настаўніку, а настаўнік паўтарае за ім. Разам яны правяраюць правільнасць вымаўлення гукаў. Настаўнік тлумачыць вучням, што цяпер яны будуць працаваць у пары і кожны з іх будзе па чарзе то настаўнікам, то вучнем.

Праца дзяцей у пары адбываецца наступным чынам: спачатку больш падрыхтаваны вучань у ролі настаўніка расказвае суседу скорагаворку, а сусед у ролі вучня яе паўтарае. Пасля чаго настаўнік нагадвае ўсяму класу, на які гук неабходна звярнуць увагу, паўтарае яго правільнае вымаўленне і пытаецца ў «настаўнікаў», ці былі памылкі ў вымаўленні гэтага гука. Педагог просіць «настаўнікаў» назваць «вучням» тыя словы, дзе гук гучаў па-іншаму. «Вучні» павінны выправіць няправільны гук і паўтарыць тое слова, у якім была дапушчана памылка. Пасля гэтага дзеці мяняюцца ролямі і ўсё паўтараецца зноў.

Ад падрыхтоўчай працы залежыць поспех выкарыстання методыкі групавой працы, якая мае свае перавагі: усе вучні расказваюць скорагаворкі, атрымліваюць практычны навык гукавымаўлення, вучацца выкарыстоўваць беларускую лексіку. Гэта вельмі важна для развіцця маўлення першакласнікаў і ўмення ўступаць у зносіны са сваімі сябрамі.

На першых уроках беларускай мовы для лепшага запамінання тэкстаў скорагаворак пажадана выкарыстоўваць ілюстрацыі скорагаворак (мал. 1) ці суадносіць паслядоўнасць падзей у тэксце з малюнкавым радам (мал. 2).

Гэта звязана перш за ўсё з навыкам чытання на беларускай мове. Справа ў тым, што навык чытання пераносіцца на беларускую мову з рускай мовы ў некалькі этапаў: 1) чытанне слоў, якія не адрозніваюцца ў рускай і беларускай мовах; 2) чытанне слоў уласнабеларускай лексікі з тлумачэннем іх значэння; 3) самастойнае чытанне.

У сувязі з гэтым пры завучванні тэкстаў скорагаворак, пакуль дзеці не авалодалі навыкам чытання, яны могуць абапірацца на ілюстрацыі, затым на словы і ілюстрацыі і потым ужо на сам тэкст.

Паступова па меры авалодання дзецьмі парнай формай працы і самастойным чытаннем можна пераходзіць пры працы ў парах ад паўтарэння скорагаворак за настаўнікам да самастойнага вывучэння вучнямі. Напрыклад, калі скорагаворка доўгая або падзелена на дзве часткі, то вучні першага варыянта могуць прачытаць і расказаць свайму суседу па парце першую частку скорагаворкі, а вучні другога варыянта паўтараюць за імі гэтую частку тэксту. Затым вучні другога варыянта чытаюць і расказваюць свайму суседу па парце другую частку скорагаворкі, а вучні першага яе паўтараюць.

Такім чынам, на этапе вывучэння і назапашвання мэтазгодна сістэматычна вывучаць скорагаворкі ў час маўленчай размінкі, прытрымліваючыся пэўнага алгарытму дзеянняў і з апорай на ілюстрацыі ці малюнкавы рад тэксту. На кожным уроку неабходна вывучаць з дзецьмі па адной новай скорагаворцы і пасля перыядычна яе паўтараць. Паступова колькасць вывучаных скорагаворак назапашваецца, і можна пераходзіць да наступнага этапу — актыўнага выкарыстання, аднак пры гэтым вывучэнне новых скорагаворак пажадана рабіць паралельна.

**Другі этап: актыўнае выкарыстанне.**

Для працы са скорагаворкамі лепш за ўсё выкарыстоўваць інтэнсіўныя адукацыйныя тэхналогіі, якія садзейнічаюць эфектыўнаму засваенню ведаў. Адной з такіх эфектыўных інтэнсіўных тэхналогій у галіне фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі з'яўляецца ***тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання***, прапанаваная В. К. Дзьячэнка.



Рыбак Рыгор рыбачыў на рацэ.

*Малюнак 1*



Даў Грыша Галі грушу,



Галя Грышу – ягады.

*Малюнак 2*

В. К. Дзьячэнка разглядае навучанне як асобны выпадак зносін і вылучае чатыры формы навучання, якія адпавядаюць чатыром існуючым формам зносін: 1) зносіны настаўніка з навучэнцам; 2) зносіны ў пары; 3) групавыя зносіны; 4) зносіны ў парах зменнага саставу. Адпаведна з гэтым ім выдзяляюцца чатыры агульныя формы арганізацыі навучальнага працэсу, якія прадстаўлены ў табліцы 2.

*Табліца 2* — Формы арганізацыі навучальнага працэсу

| Формы арганізацыі | Асаблівасці |
|---|---|
| Індывідуальная | Вучань працуе самастойна па заданні, інструкцыі настаўніка |
| Парная | «Настаўнік — вучань», «вучань — вучань» (адзін кажа, другі слухае) |
| Групавая | «Настаўнік — вучні», «вучань — вучні» (адзін кажа, усе слухаюць) |
| Калектыўная | Палова вучняў кажа, палова слухае |

Трэба адзначыць, што ў тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання парная форма арганізацыі выкарыстоўваецца ў трох відах:

1. *Статычная пара*, якая аб'ядноўвае па жаданні двух вучняў, якія мяняюцца ролямі «настаўнік — вучань».

2. *Дынамічная пара*, дзе чацвёра вучняў рыхтуюць адно заданне, якое мае чатыры часткі. Пасля падрыхтоўкі сваёй часткі задання і самакантролю вучань абмяркоўвае сваё заданне тройчы, з кожным сваім партнёрам, прычым кожны раз яму неабходна мяняць логіку выкладу, акцэнты, тэмп і т. п., уключаць механізмы адаптацыі да індывідуальных асаблівасцей суразмоўца.

3. *Варыяцыйная пара*, у якой кожны член групы атрымлівае сваё заданне, выконвае яго, аналізуе разам з настаўнікам, а затым праводзіць узаеманавучанне па схеме са сваімі трыма партнёрамі. У выніку кожны вучань засвойвае чатыры «порцыі» вучэбнага матэрыялу.

Такім чынам, тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання забяспечвае ўключэнне вучня ва ўсе магчымыя формы навучальнага ўзаемадзеяння і дазваляе адначасова рэалізаваць патэнцыялы індывідуальнай, парнай, групавой і калектыўнай дзейнасці навучэнцаў. Акрамя таго, тэхналогія спрыяе больш трываламу засваенню ведаў праз актыўную пазнавальную дзейнасць.

Пры працы са скарагаворкамі з дапамогай тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання на этапе моўнай размінкі ў I класе можна выкарыстоўваць групавую форму працы «вучань — вучні» і парную форму арганізацыі працы «вучань — вучань». Мэтазгодна пачынаць з парнай формы, паколькі яна з'яўляецца больш простай па арганізацыі і больш лёгкай для асваення вучнямі. Прывядзём ніжэй варыянт выкарыстання такой працы.

*Парная праца «вучань — вучань»*. Настаўнік дзеліць клас на два варыянты і раздае дзецям карткі з вывучанымі імі раней скарагаворкамі. Першы варыянт атрымлівае на картцы скарагаворку № 1, другі варыянт — скарагаворку № 2. Кожны вучань павінен расказаць сваю скарагаворку суседу па парце. Затым дзеці мяняюцца сваімі карткамі і зноў распавядаюць ужо сваю «новую» скарагаворку адзін аднаму.

*Групавая праца «вучань — вучні»*. Настаўнік чытае лічылку і такім чынам выбірае аднаго вучня. Вучань выходзіць да дошкі, выцягвае адну з прыгатаваных картак з раней вывучанымі скарагаворкамі і расказвае па ёй тую, якую ён выцягнуў. Клас слухае і затым паўтарае за ім хорам. Настаўнік зноў чытае лічылку і выбірае іншага вучня, які выходзіць да дошкі і выцягвае яшчэ адну картку са скарагаворкай. Такім чынам вучні могуць паўтарыць 2–3 скарагаворкі за адзін урок.

У далейшым, калі дзеці ўжо валодаюць навыкам чытання на беларускай мове, можна выкарыстоўваць больш складаную па арганізацыі групавую форму, дзе будуць задзейнічаны групы зменнага складу. Разгледзім гэта на прыкладзе моўнай размінкі пры вывучэнні тэмы **«Мясціна, дзе я жыву. Наша наваколле»** (урок 24). Для гэтага ўрока мы падабралі чатыры скарагаворкі, якія падыходзяць па тэме ўрока, з невялікай колькасцю слоў, каб дзеці змаглі іх самастойна прачытаць: 1) *Пёкар Пётр пёк пірог*; 2) *Вадавоз вёз ваду ад водаправода*; 3) *Дудар дудару дарма грае*; 4) *Рыбак Рыгор рыбачыў на рацэ*. Скарагаворкі напісаны на картках з малюнкамі.

Для групавой працы вучняў неабходна падзяліць чацвёркамі і размеркаваць скарагаворкі наступным чынам: вучні 1-га варыянта атрымліваюць скарагаворкі пад № 1 і № 3; вучні 2-га — скарагаворкі пад № 2 і № 4.

Кожны вучань атрымлівае картку са сваёй скарагаворкай. Ён павінен яе прачытаць і паўтарыць. Пасля гэтага ён расказвае яе сваім сябрам па камандзе, а яны ў сваю чаргу паўтараюць скарагаворку за ім з дапамогай карткі. Пры такой арганізацыі кожны з вучняў тройчы мяняе партнёра. Працуе гэта наступным чынам.

1) Вучні 1-га варыянта, «настаўнікі», расказваюць сваю скарагаворку суседзям па парце — «вучням» (мал. 3). «Вучні» павінны яе паўтарыць.

2) Вучні 2-га варыянта, якія атрымалі скарагаворкі № 2 і № 4, расказваюць свае скарагаворкі суседзям па парце і слухаюць, як апошнія паўтараюць за імі (мал. 4).

3) Вучні, якія атрымалі скарагаворкі № 1 і № 2, у кожнай чацвёрцы паварочваюцца назад да сваіх сяброў, якія атрымалі скарагаворкі № 3 і № 4, і расказваюць свае скарагаворкі, а пасля слухаюць, як за імі паўтараюць сябры (мал. 5).




Малюнак 3




Малюнак 4




Малюнак 5

4) Вучні, якія атрымалі скорагаворкі пад № 3 і № 4, расказваюць свае скорагаворкі, а пасля слухаюць, як за імі паўтараюць сябры (мал. 6).

5) Вучні, якія атрымалі скорагаворкі № 1 і № 2, расказваюць іх вучням, якія атрымалі скорагаворкі № 4 і № 3, а пасля слухаюць, як сябры за імі паўтараюць (мал. 7).

6) Вучні, якія атрымалі скорагаворкі № 3 і № 4, расказваюць іх вучням, якія атрымалі скорагаворкі № 2 і № 1, а пасля слухаюць, як сябры за імі паўтараюць (мал. 8).




Малюнак 6




Малюнак 7




Малюнак 8

Такім чынам, кожны вучань расказвае сваю скорагаворку траім ўдзельнікам сваёй групы і сам паўтарае тры іншыя скорагаворкі. Пры ажыццяўленні працы ў парах зменнага складу развіваюцца ўменні слухаць свайго суразмоўцу, дапамагаць свайму суседу. Пасля такой працы ў кожнага вучня выяўляецца высокі ўзровень засваення матэрыялу.

Яшчэ адной эфектыўнай інтэнсіўнай тэхналогіяй у галіне фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі з'яўляецца тэхналогія ***навучання ў супрацоўніцтве***. Мы дастаткова падрабязна расказвалі ў папярэднім артыкуле [7] пра гэту тэхналогію, таму тут мы толькі разгледзім варыянт яе выкарыстання са скорагаворкамі на этапе моўнай размінкі.

Узгадаем этапы рэалізацыі аднаго з варыянтаў тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве «Навучанне ў камандзе»:

1) настаўнік тлумачыць вучням заданне;

2) настаўнік размяркоўвае дзяцей на групы па чатыры вучні;

3) кожная група атрымлівае аднолькавыя заданні, якія арыентаваны на разуменне, запамінанне і замацаванне вучэбнага матэрыялу;

4) кожны вучань у групе самастойна выконвае адно з прапанаваных заданняў;

5) усе выкананыя заданні ў групе тлумачацца ўслых кожным вучнем па чарзе, астатнія ўдзельнікі групы кантралююць тлумачэнне таго, хто выступае;

6) калі ў каго-небудзь з удзельнікаў групы ў выкананні задання ўзнікалі цяжкасці або былі дапушчаны памылкі, астатнія дзеці прыходзяць ім на дапамогу: спрабуюць высветліць прычыну памылкі, тлумачаць вывучаны матэрыял і патрабуюць ад паўторнага тлумачэння выконваемых дзеянняў;

7) кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

Зараз разгледзім варыянт «Навучанне ў камандзе» пры вывучэнні тэмы **«Я і мае сябры. Беларускія імёны»** (урок 11).

**Першы этап.** Настаўнік тлумачыць вучням заданне.

***Настаўнік (Н.):*** Якія адметныя беларускія гукі мы з вамі вывучалі?

***Вучань (В.):*** Мы вывучалі беларускі гук [г].

***В.:*** А яшчэ мы ведаем гукі [ў] і [ч].

***В.:*** Яшчэ не назвалі гук [р].

***Н:*** Малайцы! Цяпер мы з вамі папрацуем з гэтымі гукамі ў групах.

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае дзяцей на групы па чатыры вучні і прысвойвае кожнаму навучэнцу нумар (1, 2, 3, 4).

***Н.:*** Мы падзелімся з вамі на групы па чатыры вучні. Групуемся па дзве парты, якія стаяць адна за адной. Вучань, які сядзіць на першай парце першага варыянта, — гэта вучань пад нумарам 1, за спінай у яго будзе вучань пад нумарам 2, справа ад вучня пад нумарам 2 будзе знаходзіцца вучань пад нумарам 3, і, нарэшце, перад вучнем пад нумарам 3 сядзіць вучань, які атрымлівае нумар 4. (Настаўнік правярае, ці ўсе вучні яго правільна зразумелі.)

**Трэці этап.** Настаўнік размяркоўвае, хто з вучняў якое заданне будзе выконваць. На дошцы вывешаны адваротным бокам чатыры аркушы з выявамі ваўка, гайкі, рабіны, чайкі.

***Н.:*** На дошцы вісяць чатыры аркушы. На кожным — нумар. Гэты нумар адпавядае вашаму нумару.

Настаўнік пераварочвае аркуш пад нумарам 1, на якім намаляваны воўк.

***Н.:*** Каго мы бачым на малюнку? *(Ваўка.)* Які беларускі гук схаваўся ў слове *воўк*? ([ў].) Значыць, вучні пад нумарам 1 будуць працаваць з гукам [ў].

Настаўнік вешае пад малюнак з ваўком картку з гукам [ў] і пераварочвае аркуш пад нумарам 2, на якім намалявана гайка.

***Н.:*** Што мы бачым на малюнку і які беларускі гук схаваўся ў гэтым слове? *(Бачым гайку. Гук* [г].*)* Значыць, вучні пад нумарам 2 будуць працаваць з гукам [г].

Настаўнік вешае пад малюнак з гайкай картку з гукам [г] і пераварочвае аркуш пад нумарам 3, на якім намалявана рабіна.

***Н.:*** Што мы бачым на гэтым малюнку і які беларускі гук тут схаваўся? *(Бачым рабіну. Гук* [р].*)* Значыць, вучні пад нумарам 3 будуць працаваць з гукам [р].

Настаўнік вешае пад малюнак з рабінай картку з гукам [р] і пераварочвае аркуш пад нумарам 4, на якім намалявана чайка.

***Н.:*** Каго мы бачым на апошнім малюнку і які беларускі гук тут схаваўся? *(Бачым чайку. Гук* [ч].*)* Значыць, вучні пад нумарам 4 будуць працаваць з гукам [ч].

Настаўнік вешае пад малюнак з чайкай картку з гукам [ч] (мал. 9).




*Малюнак 9*

***Н.:*** Кожны член групы атрымаў свой гук. А цяпер слухаем уважліва заданне: 1) вы павінны ўспомніць і прагаварыць скорагаворку з тым гукам, які вы атрымалі; 2) вам трэба назваць усе мужчынскія і жаночыя імёны, якія сустракаюцца ў гэтай скорагаворцы.

Паколькі да гэтай тэмы ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай вучні маглі вывучыць толькі адну скорагаворку на кожны гук, то гэта заданне для іх не будзе цяжкім. Аднак тут абавязкова трэба прывесці прыклад таго, як выконваць заданне. Для прыкладу можна ўзяць тую скорагаворку, якая яшчэ не вывучалася, каб пазбегнуць падказак, і на ёй патрэніравацца.

***Н.:*** Так, напрыклад, мне трэба ўспомніць скорагаворку з гукам [г]. Я падумала і ўспомніла: «Даў Грыша Галі грушу, Галя Грышу — ягады». Цяпер я шукаю імёны, якія тут сустракаюцца. Гэта імёны Галя і Грыша. Зразумела, як трэба выконваць заданне?

***В.*** *(усе разам):* Так.

***Н.:*** Зараз выконваем заданне самастойна, на выкананне вам даецца адна хвіліна.

**Чацвёрты этап.** Вучні самастойна выконваюць заданні.

**Пяты і шосты этапы**. Праца ў групах.

***Н.:*** Зараз кожны ўдзельнік групы па чарзе спачатку паўтарае сваё заданне, а потым дае свой адказ на заданне, астатнія вучні яго кантралююць. Калі вучань адчувае цяжкасці ў адказе на пытанне, удзельнікі групы прыходзяць яму на дапамогу. Праца ў групе адбываецца наступным чынам: 1 → 2 → → 3 → 4 → 1. Для гэтай працы вам даецца чатыры хвіліны.

***В. 1:*** Мне трэба было расказаць скорагаворку з гукам [ў] і назваць імёны, якія ў ёй сустракаюцца. Мая скорагаворка: «Патап пакаваў пакупнікам пакупкі ў пакункі». Тут сустрэлася імя Патап.

***В. 2:*** Мне трэба было расказаць скорагаворку з гукам [г] і назваць імёны, якія ў ёй сустракаюцца. Мая скорагаворка: «Гарбаты Рыгор гроб грыбы граблямі». Тут сустрэлася імя Рыгор.

***В. 3:*** Ты прапусціў першае слова скорагаворкі.

***В. 2:*** А, успомніў: «Руды гарбаты Рыгор гроб грыбы граблямі».

***В. 3:*** Мне трэба было расказаць скорагаворку з гукам [р] і назваць імёны, якія ў ёй сустракаюцца. Мая скорагаворка: «Раз прывёз Рыгор Цімоху мех арэхаў, мех гароху». Тут сустрэліся імёны Рыгор і Цімоха.

***В. 4:*** Мне трэба было расказаць скорагаворку з гукам [ч] і назваць імёны, якія ў ёй сустракаюцца. Мая скорагаворка: «Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне». Тут сустрэлася імя Антаніна.

**Сёмы этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы. Для эканоміі навучальнага часу дадзены этап можна правесці франтальна. Для гэтага настаўнік просіць падняцца вучням пад нумарам 1 і хорам расказаць скорагаворку. Потым адзін з вучняў называе імя або імёны, якія сустрэліся ў тэксце. Затым па аналогіі свае адказы даюць вучні пад нумарамі 2, 3, 4.

Такім чынам, праца па дадзенай тэхналогіі фарміруе маўленча-камунікатыўную кампетэнцыю, развівае навыкі зносін, актывізуе маўленчую дзейнасць.

Разгледжаныя тэхналогіі дапамагаюць рацыянальна арганізаваць адукацыйны працэс, павысіць яго эфектыўнасць, прымяняць асобасна арыентаваны падыход, ствараюць умовы для актыўнай уласнай пазнавальнай дзейнасці кожнага вучня, заахвочваюць імкненні дзяцей да пошуку сваіх траекторый і спосабаў рашэння, ствараюць сітуацыі поспеху, развіваюць самакантроль і ўзаемакантроль.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 1 класс / Министерство образования Республики Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2016. — 139 с.
2. *Мурашка, Н. У.* Эфектыўныя шляхі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў праз прыказкі і прымаўкі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2019. — № 12. — С. 7–12.
3. На нова лета... : Метадычныя распрацоўкі настаўнікаў этнашколы ў Сеніцы. — Мінск : Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, 2003. — 128 с.
4. *Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : падручнік для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. — 2-е выд. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015. — Ч. 1. — 111 с.
5. Крынічка народнай творчасці : зборнік фальклорных твораў : для дзяцей мал. шк. узросту / склад.: А. У. Івановіч, А. А. Сабіч. — Мінск : Беларусь, 2018. — 222 с. — (Школьная бібліятэка).
6. *Антонава, Н. У.* Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. — Ч. 1. — 135 с.
7. *Мурашка, Н. У.* Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі беларускай мовы ў 1 класе / Н. У. Мурашка, А. С. Шылава // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2020. — №. 8 — С. 25–29.

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 23.07.2020.*